Opłatę pocztową
uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 — 6. (Wilenska 12. m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзен. Адміністр. ад 9 да 3

Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

БЕЛАРУСКАЯ НІВА

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

№. 13. Вільня, Чацьвер, 31-га сьнежня 1925 г. **Год I.**

З Новым Годам!

— „З Новым Годам!“

З гэткімі славамі, згодна з традыцыяй адвечнай, зварачаемся мы сяньня да ўсяго беларускага народу—да нашае працоўнае вёскі і работніцкага места, да ўсяе непадзельнае сям'і беларускіх рабачаяў, што служаць сваёй Бацькаўшчыне працай мускулаў ці інтэлекту свайго.

У гэтым традыцыйным вітаньні зьмяшчаецца глыбокая вера людзей у лепшую будучыну, у сталы поступ людзкасьці на дарозе да агульнага шчасьця і зьдзейсьненьня высокага ідэалу волі. Які-б благі ні быў сёньняшні дзень, заўсёды чалавек хоча верыць, што заўтра будзе лепей!

Гэтая вера—часта напоўсьвядомая—гэта наш вялікі, бясцэнны скраб. Бяз гэтае веры нельга было-б ані жыць, ані — тым балей — змагацца і перамагаць.

І яна ўсім апраўдываецца жыцьцём—прынамся паскольку справа йдзе аб жыцьцё не адзінак, а цэлых народаў. Раз народ жыве, ён ня можа спыніцца ў сваім росьце, у ўзбагачваньні сваіх духовых і матэрыяльных скарбаў. Інакш яму пагражае нямінучая сьмерць...

Народ беларускі і гісторыя яго адраджэньня якраз і выяўляюць гэтую вялізарную творчую сілу, якая захавана ў жывым народзе. Ад паднявольчага, забітага, загнанага батрака-беззямельніка, ня ведаўшага нават свайго імя, беларус за 25 гадоў адраджэнскае працы дарос да таго, што стаўся дзяржаўным валадаром сваей роднай зямлі!

Калі-б ня вера ў жыцьцёвую сілу беларускага народу, дык тая жменька ідэйных павадыроў яго, якая чверць веку назад паднясла адважнай рукой сьцяг Адраджэньня, мусіла-б думаць, што на нашых вачох стаўся цуд...

Але цудаў ня бывае.

Жывы народ *мусіць* расьці—і расьце!

Не на ўсенькім абшары Беларусі гэты рост адбываецца аднолькавым тэмпам: у розных варунках ён ідзе розна. Інакш на Усходзе, інакш—на Захадзе. Інакш пад уладай працоўных, інакш—буржуазіі.

Але канчаткавая мэта, канчаткавы рубеж нашага адраджэнскага руху, нашага змаганьня за беларускую ідэю — і тут, і там аднолькавыя: і тут, і там беларус імкнецца да таго, каб увайсьці ў сям'ю вольных народаў, як роўны другім, стацца поўным гаспадаром на сваёй зямлі, дайсьці нацыянальнага, палітычнага і сацыяльнага вызваленьня.

І кожны год, хоць мо' ня ў роўнай меры, набліжае нас да гэтае мэты. Наблізіць нас да яе мусіць і гэты год, які толькі што нарадзіўся. Праз той туман, які спавівае прад намі будучыну, наш ідэал бачыцца нам з кожным годам усё бліжэйшым, усё больш выразным—зьдзейсьненым.

Дык-жа—„з Новым Годам!“

* * *

Мы прывыклі казаць:
Новы год! прыдзі к нам...
Хто нам можа што даць?
— Мы! ты сам!
Калі будзем мы спаць—
Будзе лепей панам...
Хто нам можа што даць?
— Мы! ты сам!
Нам ня трэба чакаць
Покі прыдзе хто к нам,
Хто нам можа што даць—
— Мы! ты сам!

Малады.

Навагодні нумар нашае газэты, які выйшаў у аб'ёме 6 страніц, сканфіскаваны камісарам ураду на м. Вільню, п. Вімборам, за агляд беларускага жыцьця „За мінулы год“ і за стацьцю „Паміж Захадам і Усходам“.

Сьвяточны падарак Лігі Народаў меншасьцям.

На сьняжнёвай сэсіі Рады Лігі Народаў паміж іншымі справамі, на самым канцы працы—так сказаць „на затычку“,—разглядалася і справа многапакутных нацыянальных меншасьцяў.

Як ведама, на апошнім Агульным Сабраньні Лігі літоўскі дэлегат спрабаваў паставіць пытаньне аб ахове ўсіх так-званых „недзяржаўных“ народаў, парэзаных і раздадзеных розным дзяржавам, на больш агульны і пляновы грунт. Дык вось у выніку гэтай, выклікаўшай тады запраўдны скандал, прапазыкі п. Гальванаўскаса—Рада Лігі змушана была заняцца гэтай справай.

І вось вельмі цікавае для пануючых цяпер сярод „дзяржаўных“ народаў настрояў адносна да іх „уласных меншасьцяў“—усё тое, што казалася на апошнім паседжаньні Рады.

Перад усім Рада рашуча адкінула прапазіцыю Гальванаўскаса—апрацаваць агульны, для ўсіх дзяржаваў абязываючы і аднолькавы кодэкс (сбор заканаў), які-б гарантаваў і рэгуляваў правы меншасьцяў і абавязкі дзяржаваў, узяўшых на сябе іх „ахову“. Ведама-ж: людзі ўсюды розныя, нават рознакаляровыя,—дык і „ахова“ іх ня можа быць аднолькавай: адных б'юць рэзінай, для другіх даволі „бамбукавых палак“... Ведама-ж, таксама, што—няроўныя і дзяржавы..—Есьць з іх — „вялікія“, ёсьць невялікія..—Што можна Юпітэру (старшыня лацінскіх багоў), таго ня можна бугаю,—кажа лацінская пагаворка.

Далей у Радзе Лігі Народаў пачалі гутарыць зусім... п-польску,—ня гледзячы н тое, што пакуль-што Польшча ня мае йшчэ свайго прадстаўніка ў радзе. Языком п. Скшыньскага і Ст. Грабскага, быццам прыраджоны варшавяк, першы пачаў гаварыць п. Чэмбэрлен, а з ім—п. Бэнэш, а нават і сам п. Юманс.

Чэмбэрлен заявіў, што тварцы гарантыйных трактатаў, якія забясьпечываюць правы нацыянальных меншасьцяў, зусім ня мелі на думцы ствараць з гэтых меншасьцяў асобныя самастойныя грамадзкія арганізмы, якія-б стаялі здалёк, асобна ад агульнага дзяржаўнага жыцьця гвалтам захапіўшай і ўсьцяж гвалчучай іх дзяржавы...

Прадстаўнік Чэха-Славакіі патэтычна крыкнуў пасьля гэтага, што „меншасьці не павінны залішне далёка йсьці ў сваіх дамаганьнях!“—У сваіх дамаганьнях выпаўненьня ахоўваючых гэтыя меншасьці Трактатаў і дэклярацыяў!—забыўся дадаць п. Бэнэш, маючы цяпер якраз найбольш клопату з „сваей“ нямецкай меншасьцю, ня кажучы аб славаках, без якіх ужо ня можа быць ураду ў Чэха-Славакіі...

Нават калісьці прыхільны да меншасьцяў дэлегат Бэльгіі Юманс заявіў, што „пашырэньне сыстэмы аховы меншасьцяў выклікала-б у розных дзяржавах вострыя канфлікты“..— Дык гэтай „забясьпечанай“ трактатамі аховы не павінна быць зашмат...

Добра-ж цяпер даведаліся меншасьці ўсяго сьвету, чаго маюць спадзявацца ад шляхотнай „вільсонаўскай“ Лігі „Народаў“...

Палажэньне сялян у Румыніі.

Цікавы агляд палажэньня сялян у найбліжэйшай саюзьніцы польскай, Румыніі, дае „Walka Pracy“.

Румынія, як і Польшча,—клясычны край нячуванага нідзе ў нашыя часы палажэньня сялянства. Ці была Румынія залежнай ці незалежнай, самадзяржаўнай ці „канстытуцыйнай“—усё роўна: варункі істнаваньня сялянства, аддадзенага ў кабалу „баярству“ (шляхце-абшарнікам), аставаліся заўсёды аднолькавымі. Калі ў выніку палітычных пераменаў Сэрбія і Баўгарыя зрабіліся амаль ня чыста сялянскімі краямі, дзе сяляне здабылі сабе амаль ня ўсю зямлю, Румынія край — чыста абшарніцкі...

Цікава, што, вызваліўшыся з-пад панаваньня турэцкіх заборцаў“ і здабыўшы сабе (з помачай Расеі) незалежнасьць, Румынія як-раз сталася найгоршым пеклам для сялянства: над „роднымі“ абшарнікамі ня стала чужацкай турэцкай палкі... Бо-ж „вызваленьне Румыніі“ было вызваленьнем толькі для яе фэадалаў-абшарнікаў.

Нарэшце сялянства ня вытрымала і — пад уплывам першай расейскай рэвалюцыі — у 1905—1907 г.г. пачаліся сялянскія бунты. А ў сакавіку 1907 г. вялікае сялянскае паўстаньне абхапіла ўвесь край...

Але, як заўсёды бывае, неарганізаванае, раскіданае сялянства, ня маючы адпаведных правадыроў, было пабіта па загаду паноў сялянскімі-ж рукамі — рукамі войска... Маласьведамы селянін ня меў яшчэ тады таго рэвалюцыйнага ўзгадаваньня, якое дала яму ўсюды на сьвеце — апошняя Сялянская Рэвалюцыя на Усходзе. Пры „ліквідацыі“ паўстаньня пабіты дзесяткі тысяч сялян. Шмат вёсак былі папросту спалены й зраўнаваны з зямлёй агнём артылерыі. Ніхто ніякага апору помсьце абшарнікаў і буржуазіі ня мог аказаць, бо адзіны саюзьнік селяніна — мястовы работнік пралетарыят—амаль не істнаваў навет тады ў Румыніі.

Але кроў народная, як кажуць, — зусім асаблівы плаў: ня можа яна прапасьці дарэмна, навет калі народ не здабудзе яўнай перамогі. —Пасьля здушэньня паўстаньня пачаліся „рэформы“ зьверху, а больш абяцанкі рэформаў—зямельнай і выбарнай—на карысьць сялянства. Але значна важнейшым было тое, што сярод сялянства першая спроба адкрытае барацьбы дала вельмі многа практычнай веды і рэвалюцыйнай сьведамасьці...

Пачалася самаарганізацыя сялянскіх сілаў, гуртаваньне, яднаньне сялянства; пачалося разьвіцьцё каапэрацыі і т. п... Але і тады пануючая буржуазія здолела апанаваць амаль ня ўсе эканамічныя пляцоўкі румынскага сялянства. Акурат таксама, як толькі што зроблена гэта з беларускай каапэрацыяй у Заходняй Беларусі...

Але вось прыйшла Вялікая вайна. Буржуазія пагнала і ў Румыніі сялянства на вялікую бойню народаў. З 7 мільёнаў насяленьня краю палягло на палёх бітв больш за мільён... Сялянскія гаспадаркі па ўсім краю былі амаль што не начыста выпалены знамянітым паходам Макензэна. І вось, каб падбіць сялян да „прадаўжэньня вайны да пабеднага канца“, дый каб ратавацца пасьля вайны ад хвалі народнага гневу, — румынская буржуазія ня горш за самаго п. Пілсудскага абяцала сялянству — ад імя караля — усялякія палёгкі ў жыцьці, а перад усім—Зямлю і Волю...

Але можна быць пэўным, што з рук румынскай буржуазіі і абшарнікаў сялянства не атрымала-б ніякай зямлі ані волі, калі-б—калі-б не Расейская Рэвалюцыя. Каб неяк утрымаць захопленую гвалтам Бэсарабію, румынская ўлада зрабіла спробу прыгарнуць да сябе бесарабскае сялянства. У адказ на гэта сяляне ў Бэсарабіі пачалі папросту самі адбіраць зямлю — сьпярша ад расейскіх абшарнікаў, на што ўлады глядзелі досьць прыхільна, а пасьля магутны рух перакінуўся і ў Румынію. Тут ужо румынская пануючая буржуазія пайшла на пэўную капітуляцыю — асабліва, калі ў склад дзяржавы ўвайшлі адабраныя ад Вэнгрыі і Аўстрыі вялізарныя краіны, у якіх сялянства стаяла значна вышэй эканамічна і культурна, і палітычна.

І вось толькі ў 1920 годзе нарэшце ўрад (—пад націскам сялянства і эканамічных патрэбаў—) пачаў рабіць зямельную рэформу.

Але і тут зямельная рэформа, зробленая варожымі сялянству буржуазнымі рукамі, страшэнна скрыўдзіла запраўднае бяднейшае сялянства. Зямлю, як гэта праектуецца і ў Польшчы, захапіла пераважна вясковая буржуазія дый чыноўнікі... Але ў кожным разе каля 2 мільёнаў дзес. зямлі было адабрана ад абшарнікаў, праўда па спэкуляцыйна высокай цане. Абшарнікі наагул затрымалі ў сваіх руках чацьвертую частку былых маемасьцяў. Затрымалі, зразумела, найлепшую зямлю, якую далей аддаюць у арэнду сялянству на варунках папросту кабальных. Дзякуючы адабраньню зямлі ад паноў за выкуп, атрымаўшае зямлю сялянства трапіла толькі з аднэй няволі ў другую: з няволі баярам-абшарнікам у кабалу банкам.

Не абыйшлося, зразумела, і без вялізарных надужыцьцяў з боку румынскіх урадоўцаў.

Дык у выніку ўсей буржуазнай „рэформы“—акурат такой, якую гатуюць у Польшчы эндэкі ў паразуменьні з пэпэсамі! — сялянства ня вельмі

многа выйграла... Сучасныя адносіны ў Румынскай вёсцы ў сярэднім гэткія: 65 проц. беззямельных, 25—30 проц.—сярэднякоў, 5—10 проц. — больш-менш заможных.

Сялянскія арганізацыі і партыі ў Румыніі наагул слабыя. Але, ня гледзячы на страшэнны тэрор на выбарах, сялянства правяло і праводзіць значную лічбу сваіх паслоў. Нажаль толькі, яны пасьля ў Сойме зьнюхіваюцца з пануючымі клюбамі, як пястоўцы дый вызваленцы ў Польшчы, і прадаюць сялянскую справу...

У Бэсарабіі — вельмі моцны каапэратыўны рух сярод сялянства, якое, як ведама, цягнецца да ССРР і маральна падтрымліваецца Усходам...

Дамаганьні і лёзунгі арганізаванага партыйна сялянства ў Румыніі, як і ўсюды, аднолькавыя. Сялянская „лявіца“ ў Сойме трэбуе запраўднай зямельнай рэформы, — адабраньня ўсей зямлі ў абшарнікаў, апрача 100 гэктараў, перагляду канстытуцыі, рэформы адміністрацыі, караў для зладзеяў-урадоўцаў і катаў-паліцыянтаў... Але, як і ў нас, гэтыя, як бачым, вельмі скромныя пажаданьні не спатыкаюць водгуку ў пануючай яшчэ дагэтуль буржазна-абшарніцкай большасьці (каaліцыі...) Сойму, ня кажучы ўжо аб урадзе.

Як бачым, адзіная разьніца між абедзьвюма пекнымі і кахаючымі адна адну саюзьніцамі толькі ў тым, што ў Румыніі ўжо ёсьць кароль, аб якім так лятуціць асірацеўшае абшарніцтва Польшчы... Ведама-ж, што кароль — гэта перад усім крэпасьць абшарніцтва, дык—ня дзіва, што польскія абшарнікі бачаць усе беды ў краі ў тым, што ў Польшчы якраз гэтай крэпасьці няма...

XIV Зьезд Расейскай Камуністычнай Партыі.

18-га сьнежня ў Маскве пачаўся 14-ты Зьезд Расейскай Камуністычнай Партыі.

На зьезд прыбылі 1.253 дэлегаты, якія зьяўляліся прадстаўнікамі 1 мільёну 25 тысяч арганізаваных сяброў і кандыдатаў Р.К.П.

З гэтага відаць, што за год партыя ўзрасла аж на цэлую траціну, бо на зьезьдзе мінулага году яна налічвала толькі 736.000 сяброў.

Старшынёй зьезду быў выбраны Рыков. У склад прэзыдыуму ўвайшлі ўсе правадыры партыі, не выключаючы і Троцкага.

5-гадзінны даклад ад імя Ц. К. зрабіў Сталін.

У дакладзе сваім ён падчыркнуў, між іншым, як вонкавую, таксама і ўнутраную стабілізацыю ССРР і яго вялікую прыцягаючую сілу для ўсіх паняволеных народаў і ўсей міжнародавай работніцкай клясы. Паміма ўласнай аружнай сілы ССРР, няменш паралізуе ўсялякія спакусы сусьветнага імпэрыялізму проці ССРР сымпатызуючая апошняму нязломная воля ўсяго міжнародавага пралетарыяту. З другога боку, сам сусьветны капіталізм, а перад усім Амэрыка, баіцца вайны з ССРР і жадае міру, Амэрыка—дзеля таго, што ў выпадку вайны яна страціла-б аканчальна ўсе сваі ўложаныя ў Эўропу мільярды; капіталізм — дзеля таго, што заінтэрэсаваны ў тым, каб уцягнуць ССРР у сусьветны гаспадарчы абмен.

У апошні год ССРР прымаў ужо значнае ўчасьце ў гэтым тарговым абмене: з Амэрыкай — бавоўнай (хлапком), з Англіяй і Нямеччынай—збожжам.

Спыніўшыся даўжэй на важнай справе старых даўгоў царскай Расеі на калясальную суму 30 мільярдаў руб., якія маняцца спагнаць з народаў ССРР азброеныя ліхвяры Захаду, Рыкаў сказаў, што, калі навет прызнаць гэтыя даўгі, дык трэба выставіць узаемныя прэтэнсіі ССРР на адшкадаваньне за шкоды, зробленыя краю ў часе аружных паходаў Денікіна, Калчака і Врангеля, фінансаваных тымі-ж ліхвярамі Захаду. Гэтых адшкадаваньняў урад ССРР усяго налічыў на 20 мільярдаў руб. Скасаваць закон 1917 году аб ануліраваньні (скасаваньні) гэтых царскіх даўгоў, як гэтага трэбуюць Англія і Францыя, радавы ўрад рашуча адмовіўся. Сталін заявіў, што можа быць мова толькі аб пэўных дробных уступках пры перагаворах, дый то—на пэўных варунках, з якіх першым ёсьць — адчыненьне крэдыту ССРР у англійскіх і францускіх банках. **Бязумоўна скасаванымі** ўрад ССРР лічыць **ваенныя** даўгі царскага ўраду. Канфіскаваная маемасьць грамадзян-чужаземцаў можа быць вернена — шляхам новых канцэсіяў.

У справе міжнародавай палітыкі Сталін сцьвярдзіў далейшую барацьбу ССРР за адбудаваньне на трывалых падставах сусьветнага міру. Радавы ўрад будзе далей раскрываць інтрыгі фальшывых пацыфістаў (міратворцаў) імпэрыялізму, найбольш пагражаючых гэтаму міру,—як напрыклад: Лёкарнскія Трактаты і т. п. Радавы ўрад будзе далей бязлітасна зрываць маскі з крывадушных твараў рознага роду міжнародных установаў, запраўднай мэтай якіх зьяўляецца панаваньне мацнейшых народаў над слабейшымі, — як напрыклад Ліга Народаў. Радавы ўрад мае далей узмацняць саюзы і сувязі прыязьні з усімі паняволенымі каляніяльнымі народамі ўсяго сьвету.

Што датычыць збліжэньня з капіталістычнымі дзяржавамі, дык Сталін заявіў, што ССРР перад усім будзе шукаць гэтага зблiжэньня з тымі дзяржавамі, якія найбольш пацярпелі ў мінулую вайну (Нямеччына, Баўгарыя і інш.).

Трэба адзначыць вельмі важны і новы факт у палітычным жыцьці і разьвіцьці партыі. Пасьля дакладу Сталіна з вельмі яркай і рэзкай крытыкай усіх яго думак і прапазіцыяў (ад імя Цэнтр. Камітэту!) выступіў сам старшыня Комінтэрну (III Камуністычнага Інтэрнацыяналу) Зіновьев. Зіновьвев крытыкаваў даклад з пункту гледжаньня непрымірымай лявіцы Кам. Партыі, якая імкнецца не да ўваходу ССРР ў мірны абарот сусьветнага гаспадарчага жыцьця з іншымі краямі, але да сусьветнай рэвалюцыі. Выступленьне Зіновьева выклікала вялікае хваляваньне на зьезьдзе, бо да таго паленіка з дакладчыкам Ц. К. аб асноўных справах і напрамку палітыкі лічылася недапусьцімай. Але трэба думаць, што для самога Ц. К. апазіцыйная крытыка Зіновьева не зьявілася неспадзяванкай. Яна толькі ясьней падчырківае, што адказны Радавы ўрад, кіраваны Кам. Партыяй, і Комінтэрн — зусім розныя, часта пярэчучыя адна аднэй установы.

Важнейшыя здарэньні.

У Польшчы.

Эндэцка пэпэсаўская „эканомія“.

Палітыка эканоміі — коштам найслабейшых элемэнтаў краю—трыумфуе ў Польшчы далей. — Толькі што выданы новы загад міністра асьветы Грабскага—аб пазбаўленьні з новага году ўсіх бедных студэнтаў краю дзяржаўных стыпэндыяў...

Ведама, што—паміма „эканоміі“ — пан міністар асьветы наагул ня любіць, каб бяднейшая моладзь зашмат вучылася, дый яшчэ — у вышэйшых школах... Зусім, як у добрай старой царскай Расеі: школа-ж там была „не для кухаркіных дзяцей“....

Ізноў машэнства ў пракуратуры!

„Gaz. Por. Warsz.“ падае вестку, што ў Седльцах 13 сьнежня пасадзілі пад арышт калегу віленскага Гурчына—падпракурора седлецкага акружнога суда Пётру Трусковскага, які падрабіў чужую подпіс на вэксалі.

Трусковскага перавезьлі ў вастрог у Варшаву.

Заграніцай.

ССРР пагражае Афганістану і Індыі?

З Лёндану падаюць сэнсацыйную вестку, быццам **радавыя войскі захапілі вартоўню Даркбад, у Афганістане. Гэта — найвузейшы праход сярод гор, праз які йдзе дарога з Туркестану ў Індыю.** Бальшавікамі захоплены пры гэтым афганскі параход на рацэ Оксус, што тут працякае.

Аб далейшых выніках гэтага здарэньня пакуль-што судзіць рана.—але ў кожным выпадку гэта **грознае напамінаньне Англіі**: цяжка ей будзе ўтрымаць сваю ўладу ў Індыі, калі індыйскім незалежнікам падасьць руку помачы ССРР!...

Расейска-турэцкі дагавор.

Вялікую сэнсацыю зрабіла сярод „вялікіх“, а запраўдны перапалох — у Англіі, вестка аб тым, што ў часе сваей візыты ў Парыжу Чычэрын падпісаў там новую ваенную ўмову ССРР з Турцыяй.

Заграпічная прэса піша, што гэты крок Чычэрына быў адказам ССРР на Лёкарнскія пакты, а з боку Турцыі, гэта—адказ на пастанову Рады Лігі ў справе Мосулю.

Радавая прэса падчырківае вялікую вагу гэтай умовы для Турцыі, якая—у выпадку ваеннага канфлікту з Англіяй — мае забясьпечаныя свае ўзьбярэжжы з боку Чорнага мора, ад нападу англійскага флёту.

Новы „Сусьветны Сабор“.

Рымскі папа склікае ў 1926 годзе новы „Сусьветны Сабор“, на якім мае быць каля 5000 дэлегатаў. Цікава, ці паедуць на заклік каталіцкага касьцёлу і праваслаўныя, і пратэстанскія папы?—Пэўна-ж—не...

А мо‘ з Польшчы і так?!...

Нязгода сярод францускіх міністраў.

Толькі-што зрэфармаванаму францускаму габінэту ізноў пагражае крызіс на становішчы міністра фінансаў. Рад міністраў заявілі, што не згаджаюцца на фінансавыя праекты новага міністра Думэра і пагразілі адстаўкай.

Адначасна проці таго-ж міністра высказалася фінансавая камісія парляманту, якая апрацавала свой уласны праект—замест прадстаўленага Думэрам. Спрэчка йдзе аб тры мільярды франкаў новых налогаў, бо міністар хоча спагнаць новых налогаў 4 з паловай мільярды, а камісія не дае больш, як паўтара.

У зьвязку з пагрозай новага крызізу франк, які быў падняўся трохі, ізноў значна паляцеў уніз...

Зачыненьне манархічных арганізацыяў у Францыі.

Рада міністраў пастанавіла спыніць дзеяльнасьць манархічных антыжыдоўскіх арганізацыяў.

Узнаўленьне наступленьня Абд‘Эль Крыма.

„Калі хочаш міру, рыхтуйся да вайны“, казала старажытная лацінская прыказка. І вось,

Адраджэньне беларускага малярства.

Старая і народная творчасьць.

Кожны раз, як нам даводзілася гаварыць аб беларускім мастацтве, паскольку гэта адносілася да малярства і розных відаў рысунку, — мы мелі на думцы толькі два роды малярства і аздобніцтва: старадаўнае і народнае. Першае абыймала перад усім беларускую іконапісь, у якой бачым вельмі цікаўнае і характэрнае для ўсяго нашага культурнага жыцьця зьліцьцё ўплываў усходнябізантыйскіх і заходніх; другое—народныя ўзорыстыя тканіны—гунькі, паяскі, рушнікі, крашаніну, аздобы на вырабах з дрэва, „пісанкі“ (маляваныя яйкі), урэшце так-званыя „лубкі“ — рамесьніцкія рысункі, выразаныя на лубе і рознымі калёрамі адбіваныя на паперы. Вось, бадай і ўсё ў межах малярства і графікі, што мы дагэтуль мелі і аб чым маглі гаварыць.

Але рост нашага культурнага жыцьця і ў гэтай галіне мастацкае творчасьці прыносе нам важную навіну: сьледам за адраджэньнем беларускае літэратуры, беларускае музыкі і беларускага тэатру, на сцэну выступае і **адраджонае — новае — беларускае малярства.** І вось, ня кажучы ўжо аб працах распыленых па ўсей Беларусі паадзінокіх беларускіх мастакоў-маляроў, большасьць якіх працавала дагэтуль для расейцаў і палякоў, мы бачым урэшце **зборнае, аб‘яднанае выяўленьне самастойнае беларускае мастацкае творчасьці.**

Якраз на парозе новага году ў Менску адчынілася **Першая Усебеларуская Мастацкая Выстаўка.** Зьяўляючыся выстаўкай ня чыста нацыянальнай, а тэрыторыяльнай, яна абняла і прадставіла нам сучасны стан мастацтва перад усім дзьвюх нацыянальнасьцяў Усходняе Беларусі: **баларускага і жыдоўскага.**

Падрахунак новых сіл.

Вельмі цікаўны **„падрахунак мастацкіх сіл“** Беларусі, як яны выявіліся на менскай выстаўцы, дае праф. М. Шчэкаціхін у адным з апошніх нумароў „Сав. Бел.

Вось, што ён піша:

„У колькасным сэнсе падрахунак, зроблены выстаўкай, можа лічыцца навет болей, як здавальняючым: 85 мастакоў, ня лічачы вучняў, і больш за 1100 экспанатаў—гэтыя лічбы амаль у два разы перавысілі папярэднія разрахункі, выявіўшы цэлую армію мастацкіх сіл, багаты матар‘ял для нашага мастацкага будаўніцтва. Па якасьці, зразумела, матар‘ял гэты не аднастайны, але досьць цікавы і заслугоўвае нашай ўвагі, паколькі можна судзіць з першага беглага агляду.

„Асноўная рыса выстаўкі—гэта вядомая „рознакаляровасьць“, адсутнасьць адзінага аблічча і вузкай праграмнасьці. У даным выпадку гэта ня мінус, а плюс. Падрахоўваючы нашы сілы, мы будавалі выстаўку не па мастацка-фармальных або ідэёвых прынцыпах, але чыста тэрытарыяльна, з тых, хто працуе на Беларусі, ці зьяўляецца яе ўраджэнцам. З гэтай прычыны ў мастацкім сэнсе на выстаўцы прадстаўлены самыя розныя мастацкія напрамкі. Якая вартасьць гэтых напрамкаў—высьветліцца пазьней у працэсе практычнае працы. Цяпер-жа можна толькі занатаваць іх і выявіць асноўныя іх узаемаадносіны на выстаўцы“.

Тры напрамкі.

„З фармальнага боку вызначаюцца тры паасобныя ўхілы: найбольшую масу складаюць натуралісты і рэалісты розных адценьняў, утвараючы здаровае і жыцьцёвае ядро; другім выразным і глыбока сваячасным напрамкам зьяўляюцца імкненьні да дэкарацыйнае стылізацыі на рэальнай і часта нацыянальнай аснове, з ухілам у бок практычнасьці, у бок прыкладнага мастацтва; трэцяя група, нарэшце, — напрамак стылізацыйнай умоўнасьці без практычнага дапасаваньня стылізаваных форм да якіх-небудзь прыкладных мэт.

„У першым **рэалістычным** напрамку выдзяляецца некалькі паасобных падыходаў: акадэмічна-натуралістычны—у працах Сьляпяна, Кругэра, Бэна, часткова настаўніка Віцебскага Тэхнікуму Воўкава; імпрэсыёністычны—у частцы карцін Кудрэвіча, таксама ў гомельскіх мастакоў Русецкага і Наўроўскага з суценьнем вядомай „врубэлеўшчыны“; нарэшце — новыя фармальныя шуканьні на асновах спозьненага „сэзанізму“ — у Касталянскага, сярод мастакоў Менску і асабліва ў працах маскоўскае групы Вхутэмасаўцаў. Часткова да іх набліжаецца таксама Бразэр. Шмат якія з больш дробных мастацкіх сіл прытрымліваюцца звычайнага натуралізму па меры сваіх тэхнічных магчымасьцяў.

„Другі напрамак—**дэкарацыйна-стылізаваны**—характэрны галоўным чынам для Беларускага мастацкага тэхнікуму. Выходзячы з натуры, як паказваюць, напр., некаторыя вучнёўскія этюды і натурморты, напрамак гэты імкнецца да монумэнталізацыі натуры, або да арнамэнтальнага яе вырашэньня ў формах практычна-прыкладнага дэкарацыйнага мастацва. Часткова да гэтага-ж напрамку набліжаюцца некаторыя паасобныя мастакі і графікі. Апрача стылізацыі натуры, заслугоўваюць тут увагі таксама і спробы распрацоўкі **беларускага народнага і старажытнага арнамэнту**, — што мы ізноў сустракаем ня толькі ў працах тэхнікуму, але і ў іншых мастакоў, напр., у графіцы Тычыны.

„Нарэшце, трэці напрамак прадстаўлены цэлым шэрагам мастакоў, сярад якіх дзіўным чынам настаўнікі технікуму Эндэ і Лебедзева, а гэтаксама паасобныя экспонэнты: часткова Кудрэвіч, Быхоўскі, Юдовін і інш. Шмат якія больш дробныя ўхілы і варыянты асноўных напрамкаў мы, зразумела, ня маем магчымасьці тут зазначыць. У агульным вывадзе трэба толькі падкрэсьліць гэтую розьніцу напрамкаў і падыходаў, якая сьведчыць аб досыць значным багацьці нашых мастацкіх сіл“.

Абд'Эль Крым, паслаўшы ў Парыж свайго афіцыяльнага паўнамоцніка дзеля мірных перагавораў з Францыяй, адначасна ўзнавіў у Марокко наступленьне на ўсім фроньце.

Ведама-ж — каб мець добрыя варункі міру, трэба, каб вораг ня думаў, што міру просіш, як пардону—ад слабасьці...

Вось цяпер і відаць, якая „праўда" пісалася і казалася афіцыяльна ў Францыі аб тым, быццам паўстаньне ў Марокко аканчальна задушана і Абд'Эль Крым—разьбіты дашчэнту..

Учасьце Амэрыкі ў канфэрэнцыі аб разбраеньні.

Прэзыдэнт Амэрыканскіх Штатаў пастанавіў на сваю адказнасьць прыняць учасьце ў скліканай Лігай Народаў канфэрэнцыі ў справе агульнага разбраеньня. З працы толькі - што адбыўшаеся сэсіі Рады Лігі ў справе гэтай канфэрэнцыі ясна відаць, што спрэчкі між дзяржавамі аб тым, каму і як разбраівацца, зацягнуліся-б прынамся на паўгода... А ўрэшце—вялікія дзяржавы абмежавалі-б свае „разбраеньне" тым, што замянілі-б старое аружжа і старыя ваенныя караблі на новыя,—лепш забіваючыя і руйнуючыя, як гэта—ў выніку Вашынгтонскай канфэрэнцыі — зрабіла Англія..

Генарал Фэнг узяў Цянь-Дзін.

З Лёндану паведамляюць, што вестка аб узяцьці народнай арміяй ген. Фэнга важнага манчжурскага места Цянь-Дзіна пацьвярджаецца. Гэткім чынам народная армія валадае цяпер усей Манчжурыяй, за выняткам абшараў, акупаваных Японіяй. Дык настаў найбольш драматычны мамэнт барацьбы за вызваленьне Кітаю,—бо паўстала пытаньне: ці ўзгарыцца вайна між Кітаем і Японіяй?!

ХРОНІКА.

Польскія навуковыя ўстановы і Беларускі Унівэрсытэт. У бытнасьць у Заходняй Эўропе праф. Пічэты, рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту (ў Менску), з боку Кракаўскае Акадэмі Навук, Кракаўскага Унівэрсытэту, Львоўскага Гістарычнага Т-ва і другіх навуковых і культурных арганізацыяў Польшчы была выяўлена вялікая зацікаўленасьць Беларусьсю, асабліва-ж — Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэтам. Пры прадажы апошняму навуковых выданьняў усе гэтыя ўстановы зрабілі скідку з цаны іх па 40—50%% і запрапанавалі абменівацца навуковымі выданьнямі.

Некаторыя беларускія навуковыя выданьні Беларускім Унівэрсытэтам ужо пасланы ў Кракаў і Львоў. Спэцыяльны бібліографічны журнал у Кракаве мае ў найбліжэйшым часе зьмясьціць абшырную стацьцю аб беларускай унівэрсытэцкай бібліотэцы ў Менску.

Характэрна, што тыя-ж самыя польскія навуковыя ўстановы абсалютна ня цікавяцца беларушчынай, паскольку яна выяўляецца **ў межах Польскага гаспадарства!** Тут для іх няма ані беларускага пытаньня, ані беларускага народу, — хаця **да вайны і да ўваскрашэньня Польшчы** якраз Кракаўская Акадэмія распачала друк вельмі багатых беларускіх этнаграфічных матэрыялаў, сабраных нябожчыкам Фэдэроўскім у Горадзеншчыне. Цяпер, калі Горадзеншчына прызнана афіцыяльна „этнаграфічна-польскай зямлёй", друк гэтае цэннае працы спыніўся... А шкада: Фэдэроўскі сабраў і часьцю зусім прыгатаваў да друку матэрыялу ажно на 14 томаў!

Можа-б гэтай справай зіцікавіўся Інбелкульт і—карыстаючыся з навязаньня зносін з Кракаўскай Акадэміяй—парупіўся-бы раздабыць рукапісы Фэдэроўскага ды надрукаваць іх?

Водгук юбілею Янкі Купалы. Чэская часопісь „Slovansky Prehled" у апошняй кніжцы сёлетняга году адзначае юбілей Янкі Купалы, які спраўлялі Беларусы, і абяцуе пасьвяціць нашаму песьняру спэцыяльную стацьцю ў чародным нумары.

Насьценны Беларускі Календар на 1926 год выйшаў ужо з друку. На аркушу паперы (велічыня — разьверненая газэта) зьмешчаны сьвятцы (праваслаўныя і каталіцкія), 10 партрэтаў выдатнейшых беларускіх дзеячоў і пісьменьнікаў (Скарыны, Ів. Луцкевіча, Дунін-Марцінкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Алеся Гаруна, Максіма Багдановіча, Зьмітрака Бядулі і Францішка Аляхновіча), ды інфармацыі аб галоўных беларускіх культурных, эканамічных і грамадзкіх установах, газэтах і журналах.

Календар павінен вісець у кожнай беларускай хаце на пачесным мейсцы!

Пэпэсы ў ролі абрусіцеляў. У Лунінцу пачаў выходзіць агітацыйны орган Партыі Польскіх Сацыялістаў „Красное Знамя"—**парасейску!**

Думаеце можа: гэта празначана для расейцаў?

Нічога падобнага: якраз для беларусаў! І газэта польскіх „сацыялістычных" абрусіцеляў сама гэтак прызнаецца да гэтага ў першым-жа нумары сваім:

„Нястача газэты ў зразумелай для вас мове здаўна была вялікай перашкодай у нашым змаганьні (з кім? з беларускасьцяй? —Рэд.) на ўсходніх крэсах Рэчыпаспалітай. З усіх бакоў пыталіся нас: чаму выдаем газэты ў расейскай мове, а не ў беларускай?—Таварышы! **Мы акуратна здаем сабе справу з таго, што вы—беларусы.** Але доўгія гады царскага рэжыму зрабілі сваё: навучылі вас чытаць і пісаць парасейску. Ня хочам **накідаць** вам тэй ці другой мовы (—навет роднай?!—Рэд.), пакідаем гэта нацыяналістам"...

Што гэта: ідыёцтва, ці прадстаўленьне, быццам беларускія сяляне ўсе такія ўжо ідыёты, што не зразумеюць цынізму паноў польскіх „сацыялістаў", якія стараюцца **замацаваць ліхую спадчыну ад царскіх часоў і падтрымліваць накінутую нам гвалтам масхоўшчыну?!** Для кожнага-ж ясна, што мэта паноў пэпэесаў—разрываць нацыянальную еднасьць суцэльнага беларускага народу, і пад той час, як польскія эндэкі стараюцца нам гвалтам навязываць польскую мову і гэтак адрываць частку беларусаў да польшчыны, паны „сацыялісты" робяць тое-ж шляхам абрусеньня!

Нягоднае выступленьне. Што „этычны" рэдактар абшарніцкага „Słowa" прымаў чыннае ўчасьце ў няўдалай павлюкевічаўска - дэфэнзыўнай інтрызе ў сувязі з справай „жывога нябожчыка" Шалешкі, гэта для нас ня дзіва: абшарніцкая „этыка" зусім дапускае падобныя рэчы. Ня зьдзівіла нас і тое, што якраз перад Калядамі „Słowo" зьмясьціла „пісьмо" Павлюкевіча, Якімовіча і Ул. Більдзюкевіча (кумпана Валэйшы) з нягоднай брахнёй і лаянкай па адрасу Беларускага Нацыянальнага Камітэту. Зьдзівіла нас толькі тое, што гэнае „пісьмо" надрукаваў і орган польскай „дэмакратыі" (Партыі Працы), ідэйна кіраваны паслом Хамінскім, „Kur. Wil.".

Як відаць, паскольку гэта патрэбна дзеля „дэфэнзыўных" мэт, польская „дэмакратыя" ідзе рука ў руку з абшарнікамі і наймітамі дэфэнзывы.

Спадзяемся, аднак, што апошні паступак ня пройдзе дарма ані паном рэдактарам „Słowa" і „Kur. Wil.", ані падпісаўшымся пад „пісьмом" асобам. Усе яны за вулічную лаянку ў прэсе стануць перад судом і, спадзяемся, панясуць даўно заслужаную кару.

Праявы камуністычнага руху. „Słowo" падае цікавыя весткі аб камуністычных выступленьнях у Дунілавіцкім і Слонімскім паветах.

У Дунілавіцкім пав. у ноч з 26 на 27 сьнежня былі параскіданы праклямацыі Ц. К. Сэкцыі Камуністычнае Моладзі Заходняе Беларусі.

У Слоніме—паміж местам і станцыяй чыгункі — на тэлеграфным дроце ў ноч з 24 на 25 сьнежня быў вывешаны чырвоны сьцяг з „антыпаньствовымі" надпісамі ў беларускай мове.

Праклянцьце Піліпу Морозову. У нядзелю, 27 сьнежня, у Сьв.-Духаўскай царкве ў Вільні выклінали „ojca Filipa Morozowa", які, пасьля цэлага раду гадасьцей, закончыў сваю дзеяльнасьць на ніве „польскага праваславія" тым, што прыняў каталіцтва.

Стыхійная катастрофа. У ночы з 23 на 24 сьнежня ў Вільні сталася нябывалая катастрофа. Ад масы сьнегу, які сыпаў цэлую ноч і абляпіў усе тэлеграфныя дроты, ды ад сільнага ветру — дроты гэныя паабрываліся і слупы паваліліся на зямлю цэлымі радамі. Гэтак у месьце зусім спыніліся тэлефонныя зносіны, ды яно аказалася адрэзаным ад усяго сьвету, бо тэлеграф ня мог працаваць. У некаторых пунктах места былі сарваны і дроты, што давалі з электрычнае станцыі ток дзеля асьвятленьня.

Страты вялізарныя.

Апрача Вільні, катастрофа пашырылася блізу на ўсю Віленшчыну, захапіла Навагрудчыну ды ўчасьці Палескае ваяводзтва. Гэтак за адну ноч блізу ўся Заходняя Беларусь аказалася пазбаўленай тэлеграфнай камунікацыі.

Папраўка шкоды займе ня менш трох тыдняў.

Пісьмы у рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Дазвольце цераз Вашу газэту падаць да ведама Беларускага Сялянскага Саюзу, і грамадзянства, што ў склад Часовага Выканаўчага Камітэту гэтага Саюзу (як аб гэтым паведамляла ў № 1 „Сялянская Ніва"), я не ўваходжу і што наагул адмаўляюся ад усякай актыўнай палітычнай працы, тым болей у партыі, якая яшчэ да гэтага часу не легалізавана.

Прыміце паважаньне

20/XII 1925 г. **Іван Пачопка.**

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Не адмоўцеся ўдзяліць у Вашай часопісі мейсца ніжэйпаданым радком:

У нумары абшарніцкага „Słowa" з 23 сьнежня надрукованы тры „інтэрвью" ў справе адносінаў беларускага грамадзянства да пастаноў беларускае канфэрэнцыі ў Бэрліне і да ліквідацыі так-званага „ўраду БНР". З найвялікшым зьдзіўленьнем знайшоў я сярод іх і нібы-то маю заяву, зробленую ў гэтай справе супрацоўніку „Słowa".

Не ўваходзячы ў зьмест гэнае заявы, заяўляю, што ўся яна—**проста сфабрыкавана ад першага да апошняга слова,** бо з ніякім супрацоўнікам „Słowa" **я ніякіх гутарак на гэту тэму ня вёў, і ніхто да мяне з просьбай аб інтэрвью ад рэдакцыі гэтае газэты не зварачаўся.**

Прачытаўшы „інтэрвью", я ўраз-жа зьвярнуўся асабіста да рэдакцыі „Słowa". Самога рэдактара, п. Мацкевіча, не знайшоў. Прыняў мяне сэкрэтар газэты, якому я і аддаў пісьмо з запярэчаньнем прыпісанае мне заявы. Сэкрэтар і яшчэ адзін супрацоўнік „Słowa" абяцалі гэту справу выясьніць і ў той-жа вечар **прывясьці да мяне да хаты аўтара „фальшывага дакумэнту" дзеля „очнае стаўкі".**

Аднак, ані ў **той вечар,** ані **пазьней абяцанка гэная ня была споўнена,** з чаго відаць, што рэдакцыя і бяз гэтага пераканалася ў машэнстве свайго працаўніка. Здавалася-б, што нішто не магло ўжо перашкодзіць зьмяшчэньню майго пісьма. Аднак, мінае ўжо тыдзень ад надрукаваньня фальшывага інтэрвью, выйшлі ўжо два нумары „Słowa", **а запярэчаньня хлусьні няма.**

Вывады з гэтага хай зробіць само грамадзянства, журналісты якога аж гэтак нізка маральна апусьціліся.

Вільня, 29. XII. 1925.

З пашанай **Ант. Луцкевіч.**

Сюжэты і тэмы.

„Значна менш разнастайнасьці знаходзім мы, на жаль, у сюжэтах і тэмах. З першага пагляду пераважвае пэйзаж—адна з найбольш лёгкіх і пашыраных мастацкіх галін, часта пазбаўленая асаблівай вартасьці і толькі ў некаторых выпадках цікавая, як адбітак беларускіх краявідаў. Другое месца займае партрэт і наагул чалавечыя галовы, або фігуры; добрая ў большасьці тэхніка выкананьня гэтых сюжэтаў не пазбаўляе іх, аднак, вядомае нуднасьці, і толькі паасобныя працы заслугоўваюць тут увагі ў перадачы нацыянальных беларускіх (Філіповіч, Эндэ, часткова Воўкаў), або жыдоўскіх (Пэн, Кругэр, Касталянскі, Аксэльрод) тыпаў. На жаль, занадта мала колькасьцю цэпасных кампазіцый, і наагул амаль што поўная адсутнасьць скончаных прац з перавагаю этюдаў і эскізаў. Таксама слаба выяўлены нацыянальныя бытавыя моманты: беларускія тэмы мы сустракаем, галоўным чынам, толькі ў працах Філіповіча і мастацкага тэхнікуму; жыдоўскія — у працах Пэна, ізноў-жа тэхнікуму, Юдовіна, Левіна, Горшмана і некаторых інш. Агульная маса прац усё-жа **нацыянальна** і ў той-жа час і не інтэрнацыянальна—галоўным чынам „мастацтва для мастацтва", што зьяўляецца адным з асноўных недахватаў нашых мастакоў. Таксама мала распрацаваны рэвалюцыйныя тэмы: напрыклад, сучасны савецкі быт беларускае вёскі знайшоў сабе адбітак ледзь толькі ў працы чужынца, маскоўскага мастака Уладзімірскага. Ня гледзячы на юбілейны год — рэвалюцыя 1905 года прадстаўлена ўжо ў шасьці, або сямі працах, паказваючы на вядомую адарванасьць мастакоў ад нашага сучаснага жыцьця, ад нашых імкненьняў і запатрабаваньняў. Віцебскі тэхнікум і ў гэтым сэнсе таксама дае больш за іншых".

Што нам патрэбна?

„Вось, якраз на гэты бок справы, здаецца, нам і трэба было-б зьвярнуць увагу ў першую чаргу. Які фармальна-мастацкі напрамак найбольш падойдзе для нашых практычных мэт,—гэта пакажа будучына. Бясспрэчна, больш за ўсё нам патрэбны чыста-практычны прыкладны ўхіл, але яшчэ ня гэта самае галоўнае. Аснова, зразумела, у **набліжэньні мастацтва да мас,** у вывадзе яго на шлях грамадзкае працы. Для гэтага-ж трэба спачатку ўтварыць належныя ўмовы. Трэба зацікавіць саміх мастакоў нашымі агульнымі культурна-прасьветнымі мэтамі; трэба даць ім магчымасьць бліжэй пазнаёміцца з бытам і стылем таго народу, сярод якога ім прыходзіцца працаваць; тады, быць можа, на наступнай мастацкай выстаўцы мы ўбачым мастацтва, больш блізкае да нашай сучаснасьці, больш зьвязанае ў сваіх формах, арганічна знойдзеных згодна з запатрабаваньнямі гэтага жыцьця.

„Магчымасьці ёсьць, бо падрахаваўшы нашыя сілы, мы знайшлі, паўтараю, цэлую вялікую мастацкую армію, і трэба толькі знайсьці для яе рэальную базу і добрага правадыра, каб павесьці яе да перамогі на мастацкім фроньце".

Жменя цыфраў.

У выстаўцы, на якой ёсьць тры аснаўныя аддзелы: 1) малярства, графіка і скульптура, 2) тэатр і 3) аздобніцтва і хатнія вырабы, — прынялі ўчасьце 6 мастацкіх установаў і 85 паасобных мастакоў, ня лічачы вучняў Віцебскага мастацкага тэхнікуму і членаў масы гурткоў г. Менску. З іх: мастакоў-спэцыялістаў — 43 чал., аматараў і саматужнікаў—20 і студэнтаў мастацкіх ВУЗ'аў — 22 чал. Па нацыянальнасьці яны дзеляцца так: беларусаў — 33 чал., жыдоў—34 чал., расейцаў — 11 і іншых нац.—7 чал. Экспонаты прыслалі, або падалі: з Менску—38 мастакоў, з Віцебску—5 маст., з іншых месц Беларусі—14, з іншых гарадоў Сав. Саюзу — 23 чал., з па-за-межаў Саюзу — 2 чал., ёсьць працы і трох памёршых мастакоў.

Нямашака толькі, на жаль, прац беларускіх мастакоў з Заходняе Беларусі...

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Карэспандэнцыі.

Мэдыцынская помач на вёсках Беларусі.

(Баранавіцкі і Нясьвіжскі паветы).

Многа яшчэ ў вёсках нашае Зах. Беларусі цемнаты, многа гора, беднаты. Але ніхто ня хоча прыйсьці на помач, ніхто ня рупіцца асьвяціць дарогу нашаму гаротнаму сялянству, ніхто не маніцца адкрыць яму вочы. Мусіць, многія думаюць, што лягчэй будаваць свае асабістае шчасьце на цемнаце і няшчасьці другіх...

Хто і як ня зьдекуецца з беднае мужыцкае вёскі?

Возьмем для першага разу, напрыклад, лекі. Колькі ў нас да гэтага часу яшчэ ёсьць варажбітаў, знахарак, ведзьмароў, шаптухаў?! Амаль ня кожная вёска мае такога цудатворнага „дохтара“. Чым і як яны лечаць?

Адна баба-знахарка лечыць ад усялякіх хваробаў настойкаю гарэлкі на дажджавых чарвякох або на маёвых хрушчох, даючы яе піць, націрацца і мазацца хворым. Другая курыць кнотам ды дае піць з гарэлкаю попел ад спаленага кноту. Трэйцяя смаліць валасы хворага на грамнічнай сьвечцы, дае нюхаць хвораму, а пасьля поіць гарэлкаю, запраўленаю попелам ад спаленых валасоў; кажа закусіць якім-небудзь сухаром цьвілым Сьв. Агаты, а чыстую гарэлку, як добрую рэшту ад лякарства, выпівае сам „дохтар“, заядаючы багатаю закускаю, прывезенаю пацыентам. Пры гэтым нашы цудатворцы хрысьцяцца, моляцца, хваробу й гарэлку сьвенцяць і г. д. Іншыя—лечаць мёдам, якога вымагаюць ад хворага 2—3 гаршкі. Бяруць па крышачцы мёду з кожнага гаршка, смаруюць хворае месца, змываюць вадою, а найбольш гарэлкаю, ды кажуць выпіваць. На лекі йдзе воўна з белае, або чорнае авечкі, стары здор, або жывое стракатае парася, зязюлястая курыца, аўчыны, палотны і г. д.

Часамі хворы, па загаду такога „дохтара“, пралазіць праз яму пад мяжою, праз цесны абруч, пад падрубу, вароты, ды скідае там сваю вопратку, каб пакінуць з ёю і хваробу. Усе гэтыя лекі памагаюць надта добра, але ведама—ня хворым, а варажбітам, бо ўсе гэтыя лякарствы, грошы і цудатворная гарэлка йдзе ім на карысьць.

Вось на гэта ніхто, хто й мае права й абавязак, ня хоча зьвярнуць увагу і забараніць баламуцтва, а, наадварот, памагае пашырацца такому ашуканству. Так, напрыклад, у Баранавіцкім і Нясьвіжскім павеце павятовыя дахтары бяруць падпіскі, забараняючы лячыць усім, навет і практычным старым пунктавым і валасным фэльчаром, каторыя, як кажуць, зубы зьелі на гэтай працы. Ды як можна пазбавіць вёску на месцы лекарскай помачы, не замяніўшы яе адпаведнай новай! Як можна адабраць апошні кусок хлеба ад людзей, якія аддалі ўсё жыцьцё гэтай працы, ды на старасьці да другое працы ўжо няздольны і ня маюць за сваю службу ніякае „эмэрытуры“? А варажбітам муціць і ашукваць людзей ніхто не забараняе.

А як з вёскі, часта бяз грошай, дабрацца да павятовага места за вёрст 30—40? Як дабіцца да вяльможнага пана дохтара, які часта, спадзяючыся на сваю лекарскую спрытнасьць, слухае хворых ня трубкаю і вухам, а цераз шырокі стол, не падыходзячы да хворага і не кратаючыся з мяккога крэсла? Лёгка напісаць забарону праз камэнданта паліцыі, але як быць на вёсцы пры кожным сьпешным выпадку, і як быць тым, хто ня мае за што зуб працерабіць?—Адкажэце на гэта!

Трэба наперад прыгатаваць грунт, а тагды ўжо сеяць.

„Тутэйшы“.

Усячына.

Выкрыцьце новай чалавечай расы.

Праф. Гарадкоў, які падарожнічае з навуковымі мэтамі ў Заходн. Сібіры, у лясох на р. Пура сустрэў няведамую да гэтага часу чалавечую расу. Знайшоў ён 5 пасяленьняў, дзе ўсяго жыве 600 чалавек, якіх эскімосы называюць „пыян-гасово“, г. зн. „лясныя людзі“. Аднак, самі сябе яны называюць „нэсхэн“, што азначае—„чалавек“. Гэтыя людзі адрозьніваюцца ад сваіх суседзяў колерам валос (надта цёмны) і колерам цела („мядзяны“), які тут зусім невядомы і адзіны ў гэтай мяйсцовасьці. Мова гэтых людзей крыху падобна да дыалекату, які ўжываецца ў сібірскіх стэпох. Рыбацтва і паляваньне—адзінае іх заняцьце. Праф. Гарадкоў — гэта мабыць першы чужаземец, які зьявіўся на тэрыторыі „пыян-га-сово“.

Найвялікшы ў сьвеце тунэль.

Пасьля 5 гадоў нясупыннай работы, нядаўна скончаны тунэль у Флёрэнс-Лэк (Каліфорнія, Амэрыка); тунэль гэты — зараз самы вялікі ў сьвеце. Ён злучае два горныя возеры і будзе выкарыстаны для падачы вады ў адну з буйнейшых у сьвеце гідро-электрычных установак, якая будзе даваць штогодна 1 з чвер. мільярдаў кілёўат-гадзін электрычнай энэргіі. Новы тунэль прарэзаны ў граніце і мае ў даўжыню 21 кілёмэтр; ён болей як на паўтара кілёмэтра большы, чымся вядомы Сімплёнскі тунэль у Швайцарыі, які пабудаваны болей 200 гадоў таму назад. Тунэль сьвідравалі адразу ў шасьці мясцох; для ўзрываньня граніту былі ўжыты спэцыяльныя гатункі ўзрыўчатых татар'ялаў; усюды, дзе толькі была магчымасьць, праца рабочых была заменена сілай машын. Правядзеньне гэтага тунэлю каштавала 17 мільёнаў даляраў.

Паштовая скрынка.

Гардзею Смольскаму. Маеце аплочана па 1./III 1926 год.

І. Гогану. Калі „Б. Н.“ мае паміж Вамі шмат. чытачоў, то будзем высылаць яе і надалей, не вымагаючы платы.

Падпішчыку № 2007. 2 зл. атрымалі 7./XII. паквітаваньне было ў № 10. Апроч гэтага, належыцца ад Вас 3 зл. да новага году.

Якубу Лоньку. Газэту высылаць будзем. Доўг выкасоўваем.

К. Радіуку. 4 зл. у чэрвені ад Вас атрымалі, а цяпер 10 зл., маеце аплочана па 15./I. 1926. год.

Адаму Калюціку. Ліст і грошы атрымалі. Даўгамі не клапаціцеся, калі зможаце — вернеце. Газэту з ахвотай будзем высылаць пакуль-што бясплатна. Карыстайцеся і распаўсюджвайце.

Падпішчыку № 1720. Газэты ня спынім. Карыстайцеся самі і другім давайце.

Падпішчыку № 234. Газэту высылаем і далей; калі зможаце, тады і заплоціпе.

Уладыславу Даніку. Ад Вас мы атрымалі 4 зл. 3-га красавіка. Газэты ня спыняем; як зможаце то доўг адашлеце.

П. М. Мальку. Газэту высылаем не спыняючы.

Падпішчыку № 377. Да новага году ад Вас належыць 4 зл.

Аляксандру Марчуку. Рахунак высланы Вам праз памылку; ад Вас нічога не належыцца. Маеце апочана па 15./II. 1926 г.

Падпішчыку № 1572. Газэты спыняць ня будзем; карыстайцеся ею і надалей. Як паправяцця Вашыя абставіны, то калі-небудзь заплоціце.

Падпішчыку № 915. Газэту на імя І. Міхальчыка—спыняем. Вам і надалей будзем высылаць па 3 экз. Рахунак быў высланы толькі за 1-н экз. На грошы пачакаем.

Станіславу Юшкевічу. Ад Вас атрымана 7 зл. Маеце аплочана па 15/II—26 г.

Атрымана:

Ад: — Юльяна Стрыхара, Арк. Анішчыка, Язэпа Будрыка, Мікалая Губэрта, Аляксандра Пахвіцэвіча, Тамаша Шэйна, Антона Пісарава, Аляксея Кузьміча, Аўгена Мамчыца, Шпачка, Аляксандра Андрюкевіча, Язэпа Маліноўскаго, Сымона Сяляўкі, С. Забаўскага, С. Мазурэка, Рыгора Міхайлова, Вінцэнтага Семашкі, Мікалая Ламекі, Яна Трашчоткі, Рамана Беганскаго, Цімафея Булгака, Мікалая Шчуцкага—**па 2 зл**

Ад: — Аляксадра Вашкевіча і Яна Згрунды — **па 3 зл.**

Ад: — Андрэя Ваўніка, Юстына Мурашкі, І. Барысёнка, Уладзімера Шахоўскаго, Леаніда Бялькевіча, Наваграна, Міхала Шырко, М. Скуркі, Яна Корчыка, Базыля Зыгаліна, Паўла Сэргуна, Уладзімера Балкоўскаго — **па 4 зл.**

Ад: — Ул. Вішнеўскага, Пятра Мышкі, кс. Яна Яцкевіча, Макара Сокалава, П. П. С. у Пінску, Аўгеньні Сухой, Адама Мілюка, Адама Калюціка, Мікалая Жыбуртовіча, Міхала Кулакоўскага — **па 5 зл.**

Ад: — Тодара Самойлюка, Паўла Борыса, Янкеля Кантаровіча, Сьцяпяна Макорова, Язэпа Срабоўскаго, Зьдзіслява Одольскаго — **па 6 зл.**

Ад: — Васіля Сідарэвіча, Пятра Бувашы і Елісея Каршуна — **па 7 зл.**

Ад: — В. Жэмайдзіка, Аляксандра Романюка, К. Родчука, Пятра Кушнера, Яна Рымара — **па 10 зл.**

Ад: — Гардзея Смольскаго і Зьмітра Даргеля — **па 12 зл.**

Ад: — Мікалая Ліхуты і Саўкі Васілевіча — **па 16 зл.**

Ад: — Міхала Калача — 8 зл., Міхала Тымашэвіча — 3 зл. 80 гр., Васіля Юрэвіча — 1 зл. 50 гр., Уладзімера Кныша — 1 зл., Александра Куліка — 9 зл. 50 гр., Флярьяна Мацюшкі — 9 зл.

СЯЛЯНЕ! Памятайце, што **„Беларуская Ніва“**—гэта адзіная вашая газэта, якая няўхільна бароніць вашыя нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы, а **існаваньне яе залежыць ад вас.**

Дзеля гэтага **акуратна шліце падпісныя грошы** і намаўляйце да гэтага другіх.

Хто ў цяжкую пару задоўжыўся, хай, сабраўшы з поля, **адашле свой доўг!**

Рэдактар-Выдавец: **Ян Марціноўскі.**

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.